5 Культуралагічнае параўнанне, спалучанае з дэманстрацыяй, з мэтай абагульнення.

– Ці ведаеце вы, з якімі відамі мастацтва цесна звязана літаратура? *(музыка, мастацтва, тэатр).* Вы ведаеце спектаклі, у якіх ёсць тэма зімы? (“*Шчаўкунчык*”).

– Настаўнік дэманструе відэаўрывак са спектакля “Шчаўкунчык”, а менавіта танец сняжынак. Якія вашы ўражанні пасля прагляду відэа і пасля верша? Ці адрозіваюцца яны? А настрой у іх?

– А ці ведаеце вы якія-небудзь музычныя творы, прысвечаныя зіме? Зараз я ўключу вам запіс мелодыі Антоніа Вівальдзі “Поры года. Зіма” і Пятра Чайкоўскага “Поры года. Зіма”. Ці падобныя яны?

Такім чынам, знаёмства з творчасцю Паўлюка Труса ў сярэдняй школе адбываецца толькі адзін раз, таму на ўроку мэтазгодна звярнуцца да біяграфічных звестак паэта, а таксама выкарыстаць максімальную колькасць заданняў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, каб гэтае знаёмства было для іх запамінальным.

**Літаратура**

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу : 15.04.2024.

2 Бельскі, А. І. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. І. Бельскі, М. І. Навумчык, Л. К. Цітова. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 240 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*Р.Барадулін**

***Д. Л. Казлова***

## МЕТАДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ВОСЬМЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле разглядаецца методыка работы з вершам Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей”, які прапанаваны для вывучэння ў восьмым класе. Аўтар падрабязна паказвае схему працы над лірычным тэкстам, прапаноўвае шэраг заданняў, якія дапамогуць вучням зразумець твор, засвоіць мастацкія тропы. Акрамя гэтага, у артыкуле разглядаюцца метадычныя падыходы да азнаямлення вучняў з паняццем “лірыка” ў межах тэмы “Роды мастацкай літаратуры”.*

Вывучэнне творчасці Рыгора Барадуліна займае значнае месца ў школьным курсе беларускай літаратуры. Дзеці аналізуюць вершы паэта ў шостым і восьмым класах, у адзінаццатым класе асэнсоўваюць яго біяграфію і лірыку манаграфічна. У 8-м класе вывучэнне творчасці Р. Барадуліна адбываецца ў раздзеле “Роды мастацкай літаратуры”. Вучэбная праграма ў межах тэмы ўрока прапануе разгледзець наступныя аспекты: “Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей». Адносіны чалавека да роднага дому, мясцін, дзе праходзіла дзяцінства і юнацтва. Пачуцці і перажыванні, звязаныя з успамінамі пра родных і блізкіх, як выяўленне духоўнасці асобы. Выкарыстанне вобразных магчымасцей мовы (эпітэты, метафары), рытмічных сродкаў. Адметнасць аўтарскай інтанацыі” [1]. На ўроку па вывучэнні гэтага твора, у адпаведнасці з праграмай, трэба пазнаёміцца з паняццямі “роды літаратуры” і “лірыка” як адзін з іх.

Методыка вывучэння лірыкі адрозніваецца ад падыходаў да вывучэння эпічных і драматычных твораў. Слова ў лірыцы нагружана болей, чым у эпасе, рытм стварае дадатковыя значэнні. Як адзначае А. Брадзіхіна, “пры працы над лірычным тэкстам немалаважным здаецца развіццё ў школьніка здольнасці да суперажывання, што пашырыць яго эмацыянальны вопыт і ў будучым далучыць да свету эстэтычных перажыванняў, іншымі словамі, узбагаціць яго духоўны свет” [2, с. 40]. А. Руцкая дадае: “Новымі школьнымі праграмамі па літаратуры ўзмоцнены прынцып навуковасці, сістэмнасці, што дае магчымасць настаўніку <…> даць цэласную суму ведаў, цэласны погляд на лірыку як род літаратуры” [3, с. 107].

У 7–8 класах пры вывучэнні лірычнага твора павышаецца роля праблемных пытанняў, эўрыстычнай гутаркі, што дапамогуць сфарміраваць у дзяцей крытычныя адносіны да тэксту, аднак па-ранейшаму важным застаецца эмацыйны фон урока. Асноўнымі прыёмамі правядзення *ўступнага этапа* па вывучэнні верша “Трэба дома бываць часцей” стануць праца з падручнікам і слова настаўніка. Педагог павінен паведаміць, што жыццёвая дарога кожнага чалавека заўсёды пачынаецца з бацькоўскай хаты, з таго куточка, дзе ён з’явіўся на свет, дзе зрабіў свае першыя крокі, дзе прайшлі лепшыя часы яго дзяцінства. Гэта месца для кожнага з нас ёсць “святыня святынь”. З дзяцінства пераходзіць у юнацтва, а пасля і сталасць памяць пра свае вытокі, родавыя карані... На жаль, тыя людзі, пазбаўленыя гэтай памяці, ператвараюцца ў “бязродных”, манкуртаў. Лепшыя творы Р. Барадуліна былі напісаны на біяграфічным матэрыяле, і гэты верш не стаў выключэннем. Ён узнік з маральна-жыццёвага вопыту паэта, назапашанага на Ушаччыне, пачынаючы яшчэ з самага маленства. На ўступных занятках настаўнік можа падаць біяграфічную даведку, выкарыстаць партрэт пісьменніка. Як адзначае А. Брадзіхіна, “яна карысная найперш пры вывучэнні твораў з элементамі аўтабіяграфізму” [2, с. 21]. Партрэт пісьменніка павінен быць добрай якасці, пажадана падбіраць такія партрэты, на якіх ёсць нешта незвычайнае, цікавае для дзіцячага вока.

Паколькі праграма патрабуе знаёмства з паняццем “лірыка”, настаўнік можа падрыхтаваць тэарэтычную даведку і паведаміць, што літаратурныя роды сфарміраваліся яшчэ ў Старажытнай Грэцыі. Лірыка – род літаратуры, які выяўляе ўнутраны свет чалавека, працэсы мыслення і духоўных перажыванняў, эмоцыі і пачуцці. Адсутнасць сюжэта, маналог ад імя лірычнага героя, сціслая афарыстычная форма, пераважна вершаваная мова, насычаная паэтычнымі тропамі, – асноўныя ўласцівасці лірычнага твора, да якога б жанру лірыкі ён ні адносіўся.

Пры вывучэнні любога лірычнага твора варта памятаць, што на ўступным этапе трэба стварыць адпаведны настрой, падрыхтаваць вучняў да ўспрымання твора. Аднак малюнкі ці музыка ў такім разе павінны цалкам адпавядаць твору, а не ўжывацца механічна. У сувязі з гэтым вершам настаўнік можа даць вучням паслухаць песню “Бацькоўскі зруб” у выкананні А. Ярмоленкі. Далей адбываецца першаснае чытанне настаўнікам верша на памяць з мэтай пазнаёміць васьмікласнікаў з вывучаемым творам, стварыць эстэтычнае ўздзеянне. Школьнікі павінны слухаць настаўніка, сачыць за вершам па падручніку непажадана, каб эмацыйнае ўспрыманне было больш выразным. Пасля абавязкова неабходна вытрымаць паўзу, каб рэзка не абарваць настрой, які ўзнік пад уражаннем ад чытання.

На *арыенціровачным этапе* можна сфармуляваць праблемнае пытанне, на якое вучні будуць шукаць адказ у працэсе аналізу: “Ці можна дома быць госцем”? Сёння пад праблемным навучаннем трэба разумець “такую арганізацыю вучэбных заняткаў, якая прадугледжвае стварэнне ў свядомасці вучняў пад кіраўніцтвам настаўніка праблемных сітуацый і арганізацыю актыўнай самастойнай дзейнасці вучняў па іх вырашэнні, у выніку чаго і адбываецца творчае авалоданне ведамі, уменнямі, навыкамі і развіццё мысленчых здольнасцей” [4, с. 61–65], – зазначае Г. Селяўко.

Трэба памятаць, што на арыенціровачным этапе трэба ўнікаць такіх прыёмаў, якія могуць парушыць паэтычнасць, да прыкладу, каменціраванае чытанне, празаічны пераказ паэзіі, складанне плана верша. Арыенціровачныя заняткі можна працягнуць рэпрадуктыўнай гутаркай з мэтай выявіць першаснае ўспрыманне твора, навучыцца аргументаваць свае думкі. Настаўнік можа прапанаваць вучням работу над пытаннямі:

1 Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш?

2 Якое ўражанне зрабіў на вас гэты твор? Спадабаўся ці не? Чым?

3 Якія вобразы, асацыяцыі ў вас узніклі, калі вы пачулі верш?

4 Да якога літаратурнага роду мы можам аднесці верш "Трэба дома бываць часцей" Рыгора Барадуліна? Што характэрна для гэтага літаратурнага роду?

Адказаць вучням на апошняе пытанне дапаможа тэарэтычная даведка настаўніка, якая гучала ў пачатку ўрока. Верш змяшчае незразумелыя словы, таму мэтазгодна правесці работу са словамі, лексічнае значэнне якіх вусням невядомае. Акрамя слова *асвер,* якое патлумачана ў падручніку, цяжкасці могуць выклікаць наступныя: аер, клямка, цыбаты, іржышча, масніца. Настаўнік можа не толькі патлумачыць значэнне гэтых слоў, але і выкарыстаць фотаздымкі, каб вучні наглядна маглі зразумець значэнне слоў.

Падчас аналізу методыка аддае перавагу паслядоўнаму шляху аналізу. А. Брадзіхіна адзначае, "што ў падрыхтаваных класах аналіз можа ісці вакол цэнтральнага праблемнага пытання (асабліва ў грамадзянскай ці філасофскай лірыцы), якое можа прыняць форму эпіграфа ўрока" [2, с. 42]. У нашым выпадку праблемна-тэматычны шлях таксама прыдатны.

Работа з вершам на этапе замацавання можа быць наступнай:

1 Эўрыстычная гутарка, спалучаная з выбарачным чытаннем, з мэтай асэнсавання ідэйнага зместу твора.

– Хто з'яўляецца лірычным героем верша? Акрэсліце яго жыццёвыя прынцыпы? Зачытайце адпаведныя радкі з верша.

– Знайдзіце і зачытайце словы, у якіх вылучаецца або гучыць заклік. Якую сэнсава-эмацыйную нагрузку ён нясе?

– Якую ролю ў творы маюць шматлікія паўторы слоў і сказаў?

– Верш пачынаецца фразай: "Трэба дома бываць часцей". Вызначце, яе сэнсавы кантэкст.

– Чаму, на вашу думку, аўтар ад абагуленай фразы на пачатку верша пераходзіць да канкрэтнага звароту да чытача ў канцы лірычнага твора, тым самым робячы пераход ад агульначалавечага да асабістага?

Настаўнік павінен падсумаваць назіранні дзяцей, заўважыўшы, што лірычны верш дазваляе ў яркай вобразнай форме, праз асабістыя перажыванні, пачуцці, думкі перадаць усхваляванасць паэта, глыбока раскрыць праблему, заклікаць сваіх чытачоў да разумення важнасці "святога" дома, дзе ты нарадзіўся, дзе зрабіў першыя крокі. Верш добра кладзецца на музыку, яго хочацца паспяваць, вершаваная форма дазваляе мацней уздзейнічаць на ўспрыняцце дзіцяці.

2 Метад "Асацыяцыі" стымулюе вучняў выказваць свае меркаванні, падзяліцца асабістым вопытам. Пры вывучэнні верша "Трэба дома бываць часцей" можна падабраць асацыяцыі да слова "дом" або "Бацькаўшчына".

3 Самастойная работа вучняў з трпамі з мэтай замацавання паняццяў, вызначэння ролі мастацкіх сродкаў у вершы. Вучням прапаноўваюцца карткі, дзе будуць дадзены азначэнні наступных паняццяў: эпітэт, метафара, інверсія, метанімія. Вучням трэба будзе суаднесці тэрмін і яго азначэнне, запоўніць табліцу, у якую неабходна выпісаць прыклады мастацкіх сродкаў з твора і іх ролю.

4 Невялікае вуснае выказванне вучняў на тэму "Бацькаўшчына заўсёды сагравае нам душу" спрыяе развіццю вуснага маўлення – аднаму з самых слабых навыкаў сучасных вучняў, якія знаходзяцца ва ўмовах білінгвізму. Вуснае выказванне павінна мець сваю завязку, развіццё думкі, пэўную кульмінацыю і галоўны тэзіс (выпрацоўку гэтага навыку настаўнік павінен трымаць пад пастаянным увагай), які будзе адстойвацца. На яго аснове будуецца план-схема выказвання, падбіраюцца прыклады, доказы, назіранні.

Работа з вершам на этапе абагульнення можа ўключаць заданні:

1 Слова настаўніка, спалучанае з праслухоўваннем музычнага твора, з мэтай абагульнення вывучанага, параўнання верша і песні.

Настаўнік павінен данесці да вучняў думку, што музыка не можа існаваць без паэзіі, а без паэзіі, хутчэй за ўсё, не было б і музыкі. Сёння існуе вялікая колькасць сапраўдных музычных шэдэўраў, у аснову якіх былі пакладзены вершы беларускіх мастакоў слова. І творчасць Рыгора Барадуліна не стала выключэннем. Педагог прапануе праслухаць музычнае прачытанне кампазітара Ігара Лучанка верша Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” у выкананні заслужанага артыста Беларусі Леаніда Барткевіча і ансамбля “Песняры”. Пасля метаду дэманстрацыі вучням неабходна будзе параўнаць верш і песню, вызначыць, чым яны падобныя, а чым адрозніваюцца. Гэта можна зрабіць у выглядзе канцэптуальнай табліцы.

2 Метад “Флэшмоб” дапаможа ўключыць вучняў у дзейнасць, дазволіць актывізаваць іх вуснае маўленне і будзе спрыяць далейшаму лёгкаму завучванню на памяць. Удзельнікі флэшмобу атрымліваюць раздрукаваныя радкі верша і без папярэдняй падрыхтоўкі чытаюць радкі адзін за адным па парадку. Пры гэтым настаўнік можа сам ці разам з вучнямі зрабіць відэаролік.

3 Гульня “Будні журналіста”. Вучні вызначаюць для сябе суразмоўцу. Далей ім прапаноўваюцца 2–3 пытанні для інтэрв’ю. На працягу трох хвілін васьмікласнікі абменьваюцца інфармацыяй па пытаннях, далей прапануецца аператыўна прадставіць вынікі работы. Напрыклад, пры вывучэнні твора Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” можна задаць наступныя пытанні: Да якога роду мастацкай літаратуры можна аднесці гэты верш? Што вы ведаеце пра такі род мастацкай літаратуры, як лірыка? Якія яе асаблівасці? Які момант з верша вам найбольш запомніўся? Чым? Якія мастацкія сродкі выкарыстоўвае аўтар у вершы?

У якасці заключнага слова настаўнік можа адзначыць, што Ушачы для Р. Барадуліна – пункт адліку ўсіх зямных каштоўнасцей. Матыў адданасці кожнага “сваім Ушачам” гучыць ва ўстойлівай і прыдатнай для ўсіх часоў барадулінскай ісціне “Трэба дома бываць часцей”. Аўтара хвалюе, што мы, адарваўшыся ад роднага парога, рэдка адведваем сваіх бацькоў, родныя мясціны, сціраем у памяці тое, што зрабіла нас моцнымі, дарослымі, цвёрдымі. За будзёнымі клопатамі губляем самыя дарагія ўспаміны маленства, страчваючы “святое штосьці”.

Праграма патрабуе ад вучняў завучвання на памяць верша “Трэба дома бываць часцей”, што стане працягам працы на ўроку. У якасці дамашняга задання можна прапанаваць і заданні творчага характару, да прыкладу, знайсці і выпісаць у сшытак дзесяць прыказак пра родны край, дом са зборніка А. Аксамітава “Прыказкі і прымаўкі”; стварыць малюнак на тэму “Мой дом – мая Бацькаўшчына”; намаляваць вокладку да гэтага верша; падрыхтаваць прэзентацыю (6–8 слайдаў) на тэму “Што для мяне ёсць Бацькаўшчына?” і інш.

Такім чынам, пры вывучэнні верша Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” у восьмым класе трэба звярнуць асаблівую ўвагу на тэарэтычны аспект, паколькі дзеці на яго прыкладзе знаёмяцца з паняццем “роды літаратуры”, абавязкова правесці работу, якая аблягчае завучванне верша на памяць, арганізаваць працу з тропамі і данесці да вучняў думку пра неабходнасць для чалавека падтрымліваць пастаянную сувязь з родным домам, бацькоўскай зямлёй.

## Літаратура

1 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” для VIII класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу: 15.04.2024.

2 Брадзіхіна, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры [Электронны рэсурс]: вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05 0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05-0232-01 Беларуская філалогія (па напрамках). Прафілізацыя: літаратурана-рэдакцыйная дзейнасць / А. В. Брадзіхіна; М-ва адукацыі РБ; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2024. – Рэжым доступу: https://dot3.gsu.by/course/view.php?id=5849. – Дата доступу: 15.04.2024.

3 Руцкая, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб.-метад. дапам. / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Мінск : «Издательство Гревцова», 2010. – 182 с.

4 Селевко, Г. К. Проблемное обучение / Г. К. Селевко // Школьные технологии. – 2006. – № 2. – С. 61–65.

**УДК 821.161.3-14*Р.Баравікова**

***Дз. І. Кіарэску***

## ФЕНОМЕН ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ РАІСЫ БАРАВІКОВАЙ

*Артыкул прысвечаны інтымнай лірыцы Раісы Баравіковай, якая разглядаецца як феномен нацыянальнай любоўнай паэзіі. Увага звернута на значныя, на наш погляд, адметнасці паэзіі, якія даюць падставу для таго, каб лічыць лірыку Р. Баравіковай нацыянальнай з’явай. Аналізуецца лірычная гераіня ў яе розных іпастасях і псіхалагічных станах.*

Раіса Баравікова – адна з літаратурных зорак беларускай паэзіі. Сваім мастацкім словам пісьменніца годна працягвае традыцыю любоўнай жаночай паэзіі ў нацыянальнай літаратуры, становячыся на адзін узровень з тагачаснымі паэткамі. Гэта адзначалася шматлікімі даследчыкамі яе творчасці. Вельмі ўдала пра гэта выказаўся ў свой час Л. Галубовіч: “Р. Баравікова працягнула традыцыйную лірыка-рамантычную лінію нацыянальнай жаночай паэзіі” [1, с. 142]. А літаратуразнаўца В. Шынкарэнка зазначала, што “ў індывідуальным светабачанні паэтэсы пераважае жаночы захоплена-сузіральны і адначасова маральна-павучальны падыход” [2, с. 570].

Працягваючы традыцыю любоўнай жаночай паэзіі, Раіса Баравікова найперш апелюе да ўласнага вопыту, які дазваляе дабівацца непаўторнага ў вершаваных радках. Вобраз кахання, прасветленага этычным і эстэтычным пачуццём, прасочваецца ў лірыцы айчыннай паэткі на працягу ўсёй яе творчасці. Гэта, па сваёй сутнасці, паэтычная філасофія кахання як загадкавага стану, дзе вітальная сіла скрыжоўваецца з сакральнаю запаветнасцю.

Акрамя глыбокіх пачуццяў, якімі прасякнуты вершы Р. Баравіковай пра каханне, у іх шмат яркіх выяўленчых фарбаў і сімвалічных вобразаў, як, напрыклад, у вершы “Я памаўчу. Ты гавары”:

*Я памаўчу. Ты гавары*
*сваёю шапатлівай мовай,*
*пакуль завейнасцю ліловай*
*ноч да канца не дагарыць.*
*Нішто не вернецца назад.*
*Пачуцці нашы ў дымцы цьмянай,*
*а ты малюеш зноўку сад*
*на капялюшыку каханай.*
*Кране тугою краявід*
*Пад боскім зоркавым кілімам,*
*і плакаць хочацца наўзрыд*
*аб нечым тайным, немагчымым* [3, с. 4].